# Бізнес і багацці Віктара Шэймана

З 2016 года расейскія і беларускія журналісты пачалі пісаць пра «Глобалкастом» – фірму, замешаную ў пастаўках санкцыйных тавараў. Пры гэтым называлі суўласніцу кампаніі – беларуску **Ганну Пушкарову.**

Пушкарова прыехала ў Беларусь з Іркуцку ў 1990-я. Вучылася ў звычайнай школе ў Дзяржынску. У 2007 годзе паступіла ў Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў на акторскае майстэрства тэатральнага факультэту.

Пра гэта нам распавёў адзін з выкладчыкаў: «Выдатная студэнтка была. Прыгожая. Як зорка з французскага часопісу. Такая перспектыўная дзяўчынка, якая думае пра сваю будучыню. У яе дзелавы характар, яна настойлівая ў дасягненні сваіх мэтаў. Са сваім задаткам можа кіраваць любым офісам».

Пушкарова скончыла Акадэмію мастацтваў улетку 2012 года, а ўвосень учорашняя студэнтка робіцца ўласніцаю прэміум-нерухомасці – кватэры на вуліцы Харужай у Менску коштам каля $ 240 тысячаў.

Праз чатыры месяцы пасля той угоды 22-гадовая Ганна засноўвае кампанію «Кідс Тайм». Кіравала фірмай ейная сястра Юлія Брыгадная. Кампаніі належала дзіцячая крама «Дзеткі-цукеркі» ў Паўднёвым Захадзе. Цяпер фірма зліквідаваная.






У 2013 годзе Ганна Пушкарова паступае ў Менскі дзяржаўны лінгвістычны ўніверсітэт. У 2015-м робіцца суўласніцаю кампаніі «Глобалкастом». Фірма заснаваная праз год пасля таго, як Расея забараняе ўвозіць харчы з заходніх краінаў у адказ на санкцыі.

Шырокай публіцы кампанія «Глобалкастом» становіцца вядомаю пасля публікацыі расейскага выдання РБК пра кантрабанду санкцыйных тавараў з Беларусі ў Расею. Сярод асноўных пастаўляльнікаў называюць і «Глобалкастом».

Кампанія сваю віну адмаўляла:

«Глобалкастом» не пастаўляе санкцыйнай прадукцыі ў Расейскую Федэрацыю, прэтэнзіі з боку кантрольных органаў РФ не атрымлівала, як іх не атрымлівалі і нашыя расейскія партнёры».

Тым не менш у зводкі «Рассельгаснагляду» фірма трапляла не раз. Гэтак, у студзені 2019 года кампанія везла ў Расею 20 тонаў грэцкіх арэхаў нібыта з Турэччыны, але на некаторых мяшках кантралёры знайшлі старыя этыкеткі, паводле якіх месца паходжання грузу – ЗША. Машыну не пусцілі ў Расею.

Факт пастаўкі санкцыйных прадуктаў з беларускага боку пацвердзіў і аналітык групы кампаніяў «Фінам» Аляксей Кораneў:

«Мы добра памятаем выдатную гісторыю з белару скімі крэветкамі, мідыямі, ківі, бананамі, якія ў Беларусі не растуць, але краінаю паходжання ўсюды паказвалася Беларусь. Былі больш складаныя схемы, калі прадукты пастаўляліся з сертыфікатам афрыканскіх краінаў. Насамрэч прадукты маглі быць з любой іншай дзяржавы».

Але не толькі кантрабандаю харчавання займаўся «Глобалкастом». Як выявіла нашае мінулае расследаванне, кампанія датычная да незаконных паставак адзення пад выглядам тканіны.

Фуру затрымалі ў Расеі, справу разглядалі ў беларускім судзе. На працэсе высветлілася, што «Глобалкастом» набыў тавар, размытніў яго ў Беларусі, атрымаўшы выгаду ад паменшаных збораў, і адправіў на рэалізацыю ў Маскву сваёй жа даччынай кампаніі, распавёў Аляксей Коранеў:

«Насамрэч буйныя пастаўкі грузу ажыццяўляюцца цалкам адкрыта фурамі альбо праз падмену грузу ў дакументах. Гэта значыць, напрыклад, адзенне афармляецца як тканіна, а тканіны абкладаюцца значна меншым мытным зборам. Гэта досыць распаўсюджанае парушэнне ў мытнай сістэме, не толькі паміж Беларуссю і Расеяй. Тут жа ішла вялікая колькасць санкцыйных прадуктаў, таму падобная практыка атрымала шырокі распаўсюд».

Суд адмовіўся прыцягнуць «Глобалкастом» да адказнасці, прыняўшы тлумачэнне кампаніі, што ў іх шмат грузаў, і яны проста не здолелі праверыць усе фуры. У выніку асудзілі кіроўцу і ўласніка машыны.

Акрамя «Глобалкастому», датычны да рээкспарту кветак у Расею паводле заніжаных коштаў і шэраг іншых кампаніяў, блізкіх да беларускіх уладных колаў. Расейскія ўлады спрабуюць прыкрыць гэтую схему, расказаў «Белсату» заснавальнік кампаніі «Кветкавы рад», сябра кіравання Асацыяцыі кветкавага рытэйлу Расеі Іван Уцянкоў:

«У нас пачаўся сапраўдны генацыд транзіту кветкавай прадукцыі праз Рэспубліку Беларусь у Расейскую Федэрацыю. Машына, гружаная кветкаваю прадукцыяй, з поўным пакетам дакументаў едзе на мяжу РБ з РФ для атрымання акту фітасанітарнага кантролю. Там яна бярэцца і ставіцца на дагляд, вязецца ў Смаленскую або Маскоўскую вобласці. Пасля дагляду машыны ўладальнікам не аддаюцца. І падобная практыка ў нас прасочваецца з 4 лютага».

Акрамя кветак, у 2017–2020 гадах «Глобалкастом» пастаўляе ў Расею адзенне, абутак, мэблю, электратэхніку, аўтазапчасткі, тканіну, ровары, дзіцячыя цацкі.

У канцы мінулага года кампанію рэарганізавалі. На яе месцы ўзнік «Глобалкастом-менеджмент», звязаны з Кіраўніцтвам справамі прэзідэнта. Фірме належыць 75 % у кампаніі «Белгеапошук». Астатнімі 25 % валодае дзяржаўнае прадпрыемства «Белзамежгандаль», падначаленае Кіраўніцтву справамі прэзідэнта.

Раней «Глобалкастом-менеджмент» таксама валодаў кампаніяй «ГардСэрвіс». Гэта адзіная ў Беларусі прыватная структура, якой Лукашэнка дазволіў ужываць зброю.

Цяпер «ГардСэрвісам» валодае **Аляксандр Мятла**, кіраўнік дабрачыннага фонду «Памяць Афгану». Фонд падтрымліваўся Віктарам Шэйманам, пацвердзіў нам палітычны аглядальнік Аляксандр Фядута:

***«Віктар Шэйман і сам былы афганец, таму ясна, што, як чалавек, які ўвесь гэты час быў у Афгане, ён спрабаваў ім дапамагчы. Сваім былым таварышам з Афганістану. Але здарылася так, што ільготы, дадзеныя гэтаму фонду, у пэўны момант сталі значна большыя за той бізнес, якім займаліся афганцы ў пачатку. Гэтым пачалі карыстацца – і вельмі актыўна – бізнесоўцы».***

Сёння «Глобалкастом-менеджмент» кіруе іншаю фірмаю – «Глобалкастом-комерсам». Менавіта апошняя цяпер і пастаўляе тавары ў Расею. Гаворка пра рээкспарт харчоў і тавараў прамысловай групы.

Паводле інсайдараў у сферы лагістыкі, рээкспарт ідзе ў тым ліку праз лагістычны цэнтр «Брэміна-Ворша», дзеля якога на мяжы з Расеяй стварылі падатковы афшор.

Праект рэалізуюць набліжаныя да ўладаў бізнесоўцы **Аляксей Алексін, Мікалай Варабей і Аляксандр Зайцаў.**




*Аляксандр Мятла прамаўляе ў Следчым камітэце. Фота: Следчы камітэт Беларусі*

Каментуе палітолаг Андрэй Суздальцаў: «Рэч у тым, што кантрабандная галіна ў Беларусі – дзяржаўная. Там некалькі дзясяткаў фірмаў зарганізаваныя набліжанымі да Лукашэнкі алігархамі. Іх страхуе Кіраўніцтва справамі прэзідэнта».

Доўгі час суўладальніцай і «Глобалкастом-менеджменту», і «Глобалкастом-комерсу» была ўжо згаданая Ганна Пушкарова. З лета і восені мінулага года ўласнікамі сталіся Яўген Жоўнер, Аляксандр Раманоўскі і Антон Новік.

Поўны цёзка Антона Новіка – сябра прэзідыуму Беларускай федэрацыі дзюдо, сын вядомага савецкага самбіста, чэмпіёна Еўропы Антона Новіка – старэйшага. Аляксандр Раманоўскі з былым прэсавым сакратаром КДБ Дзмітрыем Пабержыным валодаюць фірмай «ЮРАНЭКС-бяспека». Яўгена Жоўнера называюць даверанай асобай Віктара Шэймана.

Былы высокапастаўлены чыноўнік паведаміў, што Жоўнер раней працаваў у Кіраўніцтве справамі прэзідэнта. Пад выглядам бізнесоўцаў мы пазванілі туды: «Прозвішча, вядома, на слыху, але ў нас у апараце такіх няма».

**Яўген Жоўнер** пасяліўся ў Менску на праспекце Пераможцаў у комплексе «Славянскі квартал». Кватэра набытая ў лізінг у 2016 годзе. Магчымы кошт той угоды эксперты ацэньваюць на больш за $ 250 тысячаў.

Мы наведаліся да Жоўнера ў госці, але ён катэгарычна не захацеў з намі гаварыць: «Вы мне не цікавыя. Што вам не ясна? Мне выклікаць міліцыю, ці што? Да пабачэння!»

Што датычыць Ганны Пушкаровай, ходзяць чуткі, што яна жыве з **Віктарам Шэйманам**.

Каб праверыць гэтую інфармацыю, журналісты «Белсату» пад выглядам кур'ераў сустрэліся з сястрою Ганны, перадалі для яе нібыта паперы ад «Глобалкастому» і папрасілі праз яе зарганізаваць сустрэчу з Віктарам Шэйманам.

Пасля сустрэчы з рэдакцыяй на сувязь ніхто не выходзіў. Беспаспяховымі аказаліся спробы звязацца з Ганнаю Пушкаровай і іншым чынам.




*Віктар Шэйман*

Кіраўніцтва справамі прэзідэнта было створанае адным з першых прэзідэнцкіх указаў у жніўні 1994 года з падпарадкаваннем выключна Аляксандру Лукашэнку. З невялікай структуры, якая абслугоўвала дзяржаўныя органы, яна пераўтварылася ў вялізны холдынг, які на сёння аб'ядноўвае больш за 100 кампаніяў. Каментуе палітычны аглядальнік Аляксандр Фядута:

«Гэта дзяржаўная структура, якая кантралюе бізнес, што падпарадкоўваецца дзяржаве. Так складваецца ўжо з 1994 года, калі яе стварылі. І з самога пачатку гэта было ў яе абавязках».

У свой час Кіраўніцтва справамі прэзідэнта ўзначальвалі featureрознакаліберныя чыноўнікі. Самыя запамінальныя – **Іван Ціцянкоў, Галіна Жураўкова і Мікалай Корбут.**

Іхная дзейнасць на чале прэзідэнцкай гаспадаркі суправаджалася карупцыйнымі скандаламі і крымінальнымі справамі. Першы скандал адбыўся ў 1996 годзе і датычыў падкантрольнай Кіраўніцтву справамі прэзідэнта фірмы «ГандальЭкспа». Лукашэнка асабістым указам надзяліў яе падатковымі ільготамі «дзеля забеспячэння насельніцтва таварамі народнага спажывання».

А насамрэч пераважна алкаголь і цыгарэты ішлі ў Расею, адзначае Аляксандр Фядута: **«Раптам РФ выявіла празрыстую мяжу, дзе шмат алкаголю, які не меў на сабе пазнакі мытных збораў у расейскі скарб. І высветлілася, што гэта ідзе праз структуры, якія кіруюць справамі прэзідэнта РБ».**

У пачатку 2013 года Кіраўніцтва справамі прэзідэнта ўзначальвае Віктар Шэйман. Гэта адзіны дзейны чыноўнік з каманды, што прывяла Лукашэнку да ўлады. Кар'еру Шэйман пачынаў з пасады дзяржаўнага сакратара Савету бяспекі.

Пасля гэтага быў і генеральным пракурорам, і кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта, і памочнікам прэзідэнта ў асаблівых даручэннях. І вось аказаўся на чале прэзідэнцкай гаспадаркі.

Паводле Аляксандра Фядуты, **«Шэйман заўжды быў інструментам, і Аляксандр Рыгоравіч яго выкарыстоўваў у якасці інструмента, які зробіць усё, што загадае прэзідэнт: ён яго цалкам задавальняў».**

З прыходам Віктара Шэймана пад Кіраўніцтва справамі прэзідэнта адыходзіць паспяховае сельскагаспадарчае прадпрыемства – агракамбінат «Мачулішчы», у склад якога неўзабаве ўвайшлі шэраг былых калгасаў, Пінскі мясакамбінат і малакаперапрацоўчы завод «Малочны гасцінец».

Холдынгу належыць і гаспадарка «Усход» з Атоліна, створаная адмыслова для дастаўкі харчоў на стол Лукашэнкі ды ягонага найбліжэйшага чынавенства. У 2015 годзе Кіраўніцтва справамі прэзідэнта было першае ў вытворчасці малака сярод краінаў СНД.

У 2014 годзе з'яўляецца кампанія «Белзамежгандаль», якая займаецца продажам нафтапрадуктаў. Паводле ўкраінскай кансалтынгавай групы «А-95», у 2020-м «Белзамежгандаль» паставіў на ўкраінскі рынак 540 тысяч тонаў дарожнага бітуму, зазначае аналітык кампаніі «НафтоРинок» **Аляксандр Сірэнка: «Мы можам прааналізаваць толькі апошні год, бо ён паказальны ў прынцыпе. У нас рынак вырас удвая на роўным месцы. Усяго імпарту – прыблізна 860 тысяч тонаў у 2020 годзе. І на «Белзамежгандаль» прыйшлося 500 тысяч тонаў. То бок больш як палова паставак – гэта «Белзамежгандаль».**

Дарожны бітум з «Нафтану» і Мазырскага НПЗ ва Украіну ідзе праз даччынае прадпрыемства ў Кіеве – «БЗТ-Украіна». Кампанія дзеіць як трэйдар і атрымлівае за гэта сваю маржу, пракаментаваў дырэктар кансалтынгавай групы «А-95» Сяргей Куюн:

«Гэтага аператара намінавала Беларуская нафтавая кампанія. Яны не робяць з гэтага вялікага сакрэту. Пару гадоў таму яны нават раскрылі фінансавыя ўмовы. Па-мойму, «Белзамежгандаль» атрымлівае з тоны адгружанага бітуму $ 1,16. Вось гэта фінансавы інтарэс кампаніі. Але яна на сябе бярэ і функцыю афармлення дамоваў. Уся папяровая праца, што суправаджае гэты бізнес».

Пры Шэймане актыўна пашырае сваю дзейнасць падкантрольная Кіраўніцтву справамі прэзідэнта кампанія «Беларусьгандаль». Яна робіцца ўласнікам альбо суўласнікам некалькіх структураў у Беларусі і за мяжою. Сярод іх – «Белаграферт» у Горадні. Фірма зарэгістраваная як рэзідэнт СЭЗ «Горадняінвест» у 2016 годзе. Яна набывае сыравіну ў «Гродня Азоце» і займаецца вытворчасцю грануляванага сульфату амонію. Штогадовы аб'ём вытворчасці – 120 тысяч тонаў.

Асноўны рынак збыту – Украіна.

Паводле Белстату, за мінулы год ва Украіну паставілі больш за 146 тысяч тонаў на $ 22,6 мільёна.

Гэтак сцвярджае і эксперт рынку мінеральных угнаенняў **Сяргей Рубан: «Агульны аб'ём рынку сульфату амонію ва Украіне – 400–500 тысяч тонаў. Усё, што Беларусь магла б сюды паставіць, хутчэй за ўсё, нашым рынкам было б спажыта».**

Партнёр «Беларусьгандлю» ў гарадзенскім праекце – брытанская фірма «Fertilife Industry Limited», за якою стаіць украінскі бізнесовец Аляксандр Скрыпка.

Каментуе Сяргей Рубан: «Я б не сказаў, што гэта вельмі публічная асоба. Ёсць нашмат больш медыйна раскручаныя бізнесоўцы. Але тое, што асабіста мне вядома пра Аляксандра Скрыпку, – гэта адзін з найбольш актыўных, прадпрымальных і, самае галоўнае, сістэмных будаўнікоў бізнесу».

Аляксандр Скрыпка мае яшчэ адзін супольны бізнес з Беларуссю – кампанію «Агророзквіт», даччынае прадпрыемства Беларускай калійнай кампаніі (БКК). 60 % у «Агророзквіце» належыць БКК, 40 % – брытанскай фірме «Agrofertrans», за якою стаіць той жа Скрыпка.

**«Agrofertrans»** – шматнацыянальная кампанія, якая спецыялізуецца на вытворчасці і гандлі ўгнаеннямі. Кампанія пастаўляе прадукцыю ў 50 краінаў. Займае палову ўкраінскага рынку сульфату амонію.

Эксперт Сяргей Рубан лічыць, што «Agrofertrans» – гэта класічны трэйдар. І практычна кожная кампанія, зарэгістраваная ў краінах былога Савецкага Саюзу, для лёгкага вядзення бізнесу мае рэгістрацыю ў краінах Еўразвязу ці на тэрыторыях, адкуль ажыццяўляць бізнес нашмат прасцей, чым у зменлівых палітычных умовах, якія ўсё-такі ёсць дамінавальным фактарам для бізнесу што ва Украіне, што ў Беларусі, што ў Расейскай Федэрацыі».

«Беларусьгандаль» прадае ў Расеі тэхнічную соль праз кампанію «Аматиста групп» і трактары праз Гандлёвы дом Менскага трактарнага заводу. За мінулы год выручка ўсіх прадпрыемстваў Кіраўніцтва справамі прэзідэнта склала больш за мільярд долараў, кажа Шэйман падчас сустрэчы з Лукашэнкам у пачатку года.

Прэс-служба Лукашэнкі адзначала: «Віктар Шэйман даклаў прэзідэнту пра вынікі працы прадпрыемстваў сістэмы Кіраўніцтва справамі ў 2020 годзе, вынікі нядрэнныя. У прыватнасці, выручка ад рэалізацыі прадукцыі склала Br 2,6 мільярда (рост больш як на 140 %)».

Падчас службы на дзяржаўных пасадах сям’я Віктара Шэймана займела як мінімум два далёка не танныя дамы і кватэру.

Каля парку Горкага, у цэнтры Менску, сямейству належыць 4-пакаёвая кватэра плошчаю 98 квадратных метраў. Яна запісаная на сына Сяргея і, паводле рыэлтараў, каштуе ад $ 170 тысячаў.

У Драздах пабудаваны двухпавярховы жылы дом з тэрасай і лазняй агульнаю плошчаю 416 квадратных метраў. Плюс зямля амаль 20 сотак. Маёмасць запісаная на дачку Вольгу і ацэньваецца як мінімум на $ 400 тысячаў.

Кіраўнік праекту «Адкрытыя закупкі» **Уладзімір Кавалкін** упэўнены: **«400 тысяч долараў не вялікія грошы. Генерал і высокі чыноўнік іх сабраць і наскрэбці можа. Але, я баюся, што гэтыя 400 тысяч долараў – гэта нават не 1 % ад таго, што ёсць у Шэймана. Людзі, настолькі набліжаныя да Лукашэнкі, і людзі, якія апякуюцца такімі гандлёвымі схемамі, як нафта, гандаль зброяй, санкцыёнка... 400 тысяч долараў – гэта смешна».**

У 2017 годзе Віктар Шэйман набывае нерухомасць у вёсцы Падліпкі Пухавіцкага раёну за $ 15,5 тысячы.

Пасля чаго ўзводзіць за ўласныя сродкі на гэтай зямлі навабуд са склепам, верандай і гаспадарчым блокам агульнаю плошчаю 547 квадратных метраў.


Номер записи:
Наименование права по числу собственников: Собств...
Цена: 30 000.00 BYN
Правообладатели, иные субъекты регистрации:
Наименование/ФИО: Шейман Виктор Владимирович
Дата и время регистрации: 01.02.2017 09:38:00
Государство/Гражданство: Республика Беларусь
Доля: 1/1
Свидетельство: 11.07.2003г. Партизанским РУВД г.Минска


Доля:
Свидетельство:
УНП/Идентификационный номер:
Адрес:

| ...мента | Дата |
|---|---|
| ...областного нотариального округа ...ка и жилого дома | 27.01.2017 |







На першым паверсе – кухня, кабінеты, пакоі, а ў склепе – вінатэка, більярдная і гаспадарчыя памяшканні. Да дому прылягаюць 25 сотак. Дом ацэньваюць мінімум на $ 350 тысячаў.

І самае цікавае. Папярэднім уладальнікам участку быў **Аляксандр Мятла**.

Той самы кіраўнік фонду «Памяць Афгану», якога згадвалі раней. «Еўрарадыё» называла яго блізкім сябрам **Віктара Шэймана**.



Номер записи: 24292/06.051-2

Наименование права по числу собственников: Собственность одного лица

Цена: 0.00 BYN

Правообладатели, иные субъекты регистрации:

| | |
|---|---|
| Наименование/ФИО: Метла Александр Михайлович | Наименование/ |
| Дата и время регистрации: 10.08.2006 16:58:13 | Дата и время ре |
| Государство/Гражданство: Республика Беларусь | Государство/Гр |
| Доля: 1/1 | Доля: |
| Свидетельство: 14.05.2003г. Советским РУВД г.Минска | Свидетельство: |
| | УНП/Идентифи |
| | Адрес: |

Основания регистрации:

Наименование документа

*Дзякуем за дапамогу падчас рыхтавання матэрыялу Альянсу расследавальнікаў Беларусі.*